**I варыянт**

**1. Радзімай арабаў і рэлігіі іслам з'яўляецца:**
а) Пірэнейскі паўвостраў; б) Аравійскі паўвостраў; в) Балканскі паўвостраў.

**2. Якая з ніжэйпералічаных дзяржаў размяшчаецца на чатырох буйных і больш за чатыры тысячы малых астравоў:**
а) Кітай; б) Індыя; в) Японія?



**3. Каран – гэта:** а) свяшчэнная кніга мусульман; б) звод законаў арабаў-мусульман; в) галоўны мусульманскі храм.

**4. Унук Чынгісхана, заваёўнік Кітая – гэта:**
а) Хубілай; б) Батый; в) Чагатай.

**5. Якія плямёны стварылі ў сярэдневякоўі свае дзяржавы на тэрыторыі Амерыкі:** а) майя; б) мексіканцы; в) тальтэкі; г) перуанцы; д) сапатэкі?

**6. Устанавіце адпаведнасць:**
а) Мухамед 1) вядомы кітайскі паэт;
б) Ібн Сіна 2) прадстаўнік японскай дынастыі сёгунаў;
в) Біруні 3) заснавальнік ісламу;
г) Ду Фу 4) вядомы сярэднеазіяцкі вучоны-астраном;
д) Хулагу 5) славуты вучоны-медык, аўтар твора "Канон";
е) Мінамота 6) унук Чынгісхана, заваявальнік Ірана.

**7. Згрупуйце прапанаваныя паняцці:**
а) тытулы правіцеляў:
б) рэлігіі:
в) індыйскія варны:

1) брахманы;
2) сінтаізм;
3) шах;
4) шудры;
5) канфуцыянства;
6) султан;
7) кшатрыі;
8) халіф;
9) будызм;
10) вайш'і;
11) індуізм,
12) імператар;
13) даасізм.

**8. Растаўце ў правільнай паслядоўнасці:**
а) спробы манголаў заваяваць Японію;
б) заваяванне манголамі Кітая;
в) узнікненне дзяржавы ў Японіі;
г) час праўлення ў Кітаі дынастыі Тан.



**9. Аб'яднайце прапанаваныя паняцці ў адзіны сказ (ці тэкст):**
мусульмане, Індыя, 1206 г., Дэлі, султан, іслам, індусы.

___________________________________________________

LIVEWORKSHEETS

**II варыянт**



**1. Першапачатковымі цэнтрамі іслама, святымі гарадамі для мусульман з'яўляюцца:** а) Багдад і Дамаск; б) Самарканд і Бухара; в) Мекка і Медына.

**2. Ніпон – "Краіна узыходзячага сонца", так сваю дзяржаву называлі і называюць:** а) японцы; б) кітайцы; в) індыйцы.

**3. Халіф – гэта:** а) тытул правіцеля Кітая; б) "намеснік прарока", правіцель арабскай дзяржавы; в) арабскі военачальнік.

**4. Заснавальнік мангольскай дзяржавы, адзін з самых вядомых заваёўнікаў сярэдневякоўя:** а) Джучы; б) Чынгісхан; в) Батый.

**5. Якія дзяржавы з ніжэйпералічаных існавалі ў сярэдневякоўі на тэрыторыі Афрыкі:**
а) Гана; б) Малі; в) Сахара; г) Нігер; д) Эфіопія; е) Канем?



**6. Устанавіце адпаведнасць:**
а) Фірдаўсі 1) вядомы кітайскі мастак;
б) Ван Вэй 2) славуты кітайскі паэт;
в) Хубілай 3) славуты персідскі паэт, аўтар паэмы "Шах-намэ";
г) Амар Хаям 4) заснавальнік сярэднеазіяцкай дынастыі качэўнікаў, якая ў XI ст. захапіла Сярэднюю Азіі і Іран;
д) Лі Бо
е) Сельджук 5) мангольскі заваёўнік, імператар Кітая;
6) вядомы іранскі вучоны, паэт, філосаф, матэматык.

**7. Згрупуйце прапанаваныя паняцці:**
а) араба-ісламскія свет
б) Індыя
в) Японія

| | |
|---|---|
| 1) Вішну; | __________ |
| 2) самурай; | __________ |
| 3) хадж; | __________ |
| 4) Кааба; | __________ |
| 5) Шыва; | __________ |
| 6) сёгун; | __________ |
| 7) мячэць; | __________ |
| 8) Брахма; | __________ |
| 9) халіфат; | __________ |
| 10) Дэлі; | __________ |
| 11) Фудзіяма; | __________ |
| 12) арабеска; | __________ |
| 13) "Мірыяды пялёсткаў". | __________ |

**8. Растаўце ў правільнай паслядоўнасці:**
а) узвышэнне ў Сярэдняй Азіі ўладароў Харэзма;
б) узнікненне ісламу;
в) заваяванне арабамі Паўночнай Афрыкі
і Пірэнейскага паўвострава;
г) распад Арабскага халіфата.

**9. Аб'яднайце прапанаваныя паняцці ў адзіны сказ (ці тэкст):** манголы, пачатак XIII ст., Кітай, 70 гадоў, Хубілай, 1279 г., Пекін.

LIVEWORKSHEETS